МАЛАДЫЯ — СТАЛЫМ

ДАСТАТКОВА ПАТЭЛЕФАНАВАЦЬ

Як валанцёры БРСМ падтрымліваюць пажылых людзей

Цяпер ва ўсіх рэгіёнах краіны дзейнічаюць гарачыя лініі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі для пажылых людзей. Каб тыя, хто жыве адзін або мае інваліднасць змаглі атрымаць дапамогу па дастаўцы прадуктаў харчавання, медыкаментаў або рэчаў першай неабходнасці ад добраахвотнікаў. Паслуга бясплатная, дастаткова патэлефанаваць і пакінуць заяўку. Пры кожнай тэрытарыяльнай структуры Саюза моладзі створаны валанцёрскія штабы, якія дапамагаюць цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На сёння агульнымі сіламі ўжо прынята больш за дзевяць тысяч заявак з розных куткоў краіны, з іх Саюзам моладзі — каля шасці тысяч. І работа не спыняецца.

— Нашы валанцёры працуюць з панядзелка да суботы з дзевяці да васямнаццаці гадзін, — больш падрабязна расказвае **сакратар ЦК ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Аляксандра ГАНЧАРОВА.** — Усяго па краіне 860 чалавек, усе яны — паўналетнія студэнты і навучэнцы або прадстаўнікі працуючай моладзі. З добраахвотнікамі праводзіцца навучанне: на працягу некалькіх дзён у даступнай форме мы расказваем маладым людзям, якія прафілактычныя меры трэба прымаць, каб пазбегнуць каранавіруснай інфекцыі. Тлумачым, як правільна карыстацца індывідуальнымі сродкамі абароны (маскамі, пальчаткамі, антысептыкамі), расказваем пра механізм бескантактнай дастаўкі прадуктаў або лекаў і іншае. На гэты момант у буйных гарадах у валанцёрскіх штабах налічваецца па дваццаць валанцёраў. Пакуль такой колькасці дастаткова, але пры неабходнасці яна будзе павялічвацца.

У краіне шмат адзінокіх грамадзян, і цяпер ім асабліва важна максімальна ізалявацца ад любых кантактаў, пазбягаць грамадскіх месцаў, але пры гэтым трэба, каб ізаляцыя не паўплывала на камфорт і жыццёвыя звычкі. «Калі мы адкрывалі гарачыя лініі, разумелі, што катэгорыя грамадзян, з якімі мы ўзаемадзейнічаем, не сядзіць у сацсетках, таму нашы тэлефоны размяшчаем у раённых газетах. Тэрытарыяльныя структуры, дарэчы, змяшчаюць патрэбную інфармацыю на дошках абвестак каля пад'ездаў», — дадала Аляксандра Ганчарова.

Карэспандэнты «МС» стэлефанаваліся з куратарамі валанцёрскіх груп некаторых абласцей.

— У Гомельскай вобласці працуе больш за 130 валанцёраў, — расказвае **другі сакратар абласнога камітэта БРСМ Юлія ЛІПОЎСКАЯ.** — На сёння аказалі дапамогу больш чым трыццаці бабулям і дзядулям, прынялі больш за 60 званкоў на гарачую лінію. У сярэднім у дзень атрымліваецца не больш за дзесяць заявак па вобласці. Калі чалавеку патрэбна нешта, што не звязана з нашымі кампетэнцыямі, мы перанакіроўваем іх да вузкіх спецыялістаў. Калі валанцёры наведваюць пажылых людзей, яны імкнуцца мінімізаваць кантакт з імі, але тым, каму цяжка хадзіць, прадукты прыносяць у дом.

— Па Брэсцкай вобласці налічваецца 154 добраахвотнікі, больш за ўсё іх у Пінску і Баранавічах і, зразумела, у Брэсце — па 20 хлопцаў і дзяўчат, — расказвае **другі сакратар абласнога камітэта БРСМ Максім ХАРЫТОНІК.** — Актыўна ўключаецца ў работу і сельская моладзь. Прадукты ў большасці выпадкаў пакідаем пад дзвярыма. Па жаданні актывісты Саюза моладзі могуць дапамагчы пажылым людзям праз інтэрнэт замовіць тавары першай неабходнасці. Таксама

добраахвотнікі могуць падказаць бабулям і дзядулям тэлефоны тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і іншыя. Важна, што наша дапамога будзе працягвацца столькі, колькі спатрэбіцца.

— Усяго па нашай вобласці працуюць 168 валанцёраў, з моманту пачатку работы гарачай лініі яны наведалі больш за 160 пажылых людзей, — паведаміла **другі сакратар Магілёўскага камітэта БРСМ Ганна ДАШКЕВІЧ.** — Маладыя людзі разносяць рэцэпты дзядулям і бабулям. Таксама ў нас наладжана ўзаемазамяняльнасць: калі хтосьці з дабраахвотнікаў захварэе або не будзе паспяваць спраўляцца з задачамі, нехта з таварышаў яго заменіць або падстрахуе.

— Гэта мой першы вопыт валанцёрства, — кажа васямнаццацігадовая **студэнтка Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Вольга РАК.** — У дзень з маёй напарніцай наведваем дзвюх-трох бабулек. Хоць мы і замацаваны за Маскоўскім раёнам Брэста, яшчэ ні разу нашы «кліенты» не паўтараліся. Людзі, да якіх мы ходзім, вельмі добразычлівыя, заўсёды запрашаюць прайсці ў дом, але мы тлумачым, што цяпер гэтага рабіць нельга. Каб ведаць, пакідаць прадукты дома ці перад дзвярыма, мы загадзя бяром у пажылых людзей кантактны нумар тэлефона. У асноўным наведваем тых, хто жыве недалёка ад нас, каб дапамога была мабільная. У мяне з сабою заўсёды бэйдж з подпісам і пячаткай, які даказвае, што я член БРСМ і ўдзельніца валанцёрскага руху. Яго трэба паказваць пажылым, таму што бываюць людзі, якія хочуць падмануць састарэлых.

— Дапамагаць старэйшым для мяне не ўпершыню, гэта ўжо як лад жыцця. Валанцёрам БРСМ стаў чатыры гады таму, калі прыйшоў на месца педагога-арганізатара ў Дашкаўскую сярэднюю школу, што на Магілёўшчыне, — расказвае **трыццацігадовы Артур ШКУРКО.** — Калі ў нашай краіне ўзнікла каранавірусная інфекцыя, да якой найбольш схільныя пажылыя людзі, адразу пачалі набіраць добраахвотнікаў. Я прыступіў да работы 20 сакавіка, быў больш чым на дзесяці выездах. Аграгарадок невялікі, ёсць крама і паліклініка побач, так што з дастаўкай прадуктаў праблем няма, робім усё хутка. Заўсёды ходзім у масках, пальчатках, стараемся максімальна не кантактаваць з пажылымі. І нагадваем ім пра меры прафілактыкі: каб часцей мылі рукі, не бывалі ў шматлюдных месцах, пры дрэнным самаадчуванні звярталіся па медыцынскую дапамогу.

85-гадовая Ніна Мікалаеўна Гардзяюк з Брэста жыве ў кватэры адна, бліжэйшыя сваякі — у Жодзіне. Да валанцёраў звярталася пакуль што аднойчы, але яна ўпэўнена: гэта не апошні раз. «Калі ўзнікла сітуацыя з каранавірусам і паўсюль абвясцілі, што людзям пажылога ўзросту трэба знаходзіцца дома, унучка патэлефанавала мне і сказала, куды трэба званіць, каб дапамаглі з дастаўкай рэчаў першай неабходнасці. Дагэтуль у краму і паліклініку хадзіла сама. А тут звязалася з гарачай лініяй, і мне хутка даслалі дзвюх дзяўчынак. Вельмі спадабалася, як яны працуюць. Адчуваецца падтрымка, а яна для нас важная. Прыемна, што пра пажылых клапоцяцца і берагуць нас».

Людміле Іванаўне Ніжнікавай са Жлобіна восемдзесят восем гадоў. Жыве ў сваім доме адна. Жанчына расказвае, што самаізаляцыя для яе вялікай ролі не адыграла, бо яна і так на вуліцу амаль не выходзіла — вельмі баляць ногі. «Мне заўсёды дапамагалі сацыяльныя работнікі. А зараз даведалася і пра паслугу ад валанцёраў, зацікавілася. Ужо звярталася да іх некалькі разоў: яны не толькі купляюць прадукты, але і прыносяць лекі, ды і ў двары наводзяць парадак. Задаволеная імі і ўдзячная: маладыя людзі вельмі свядома і адказна да нас ставяцца».

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота ўзята з сайта БРСМ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению СООО «АгроЭнергия» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве – ИП Шевченко А. В. извещает о проведении 13 мая 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/1			
1	**Изолированное помещение с инв. № 333/D-58922**, **площадью 987,6 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **помещение складское**. Местонахождение: **Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/7-2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100001000159** общей площадью **10,8010 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/27)**	**134 000,00**	6 700,00	13 400,00
2	**Укомплектованная линия для брикетирования соломы LTBS** (инв. № 000000013). **Комплект оборудования** (транспортер ленточный, транспортер скребковый) (инв. № 00000006). **Удлинитель стрелы ПМС-08.600.000** (инв. № 00000008). **Весы электронные промышленные MASSA-K 4D-P-3-2000** (зав. № 0667) (инв. № 000000016)	**71 760,00**	3 588,00	7 176,00

Продавец: СООО «АгроЭнергия», 247694, Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/1. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 324-25-97 управляющий в деле о банкротстве – ИП Шевченко Андрей Викторович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 апреля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 11 мая 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.